


*Рисунок 1 – Число центров здоровья в Западной Беларуси и Польше в 1929–1938 гг. [5]*

***Заключение***

Таким образом, децентрализованная организация и экономические сложности Западной Беларуси негативно отразились на основных показателях здравоохранения. Фактически с середины 1920-х гг. лечебная сеть Западной Беларуси не прирастала: в 1925 г. в 87 больницах имелось 4714 коек (11,8 коек на 10 тыс. населения), а в 1935 г. при 99 больницах имелось 4940 коек (9,6 койки на 10 тыс. населения). В то же время в 1935 г. БССР имела уже 196 больниц при 11220 койках (20,5 коек на 10 тыс. населения), таким образом, по основному критерию эффективности медицинского обслуживания превышая Западную Беларусь более чем в 3 раза. При этом, если в БССР наблюдался перманентный рост основных показателей медицинского обслуживания, то Западная Беларусь в пересчёте на 10 тыс. населения даже ухудшила свои позиции по сравнению с серединой 1920х гг.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ

1. Национальный архив Республики Беларусь. – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 11959.
2. Государственный архив Российской Федерации. – Ф. 8009. Оп. 1. Д. 107.
3. Sprawozdanie o stanie zdrowotnym Rzeczypospolitej Polskiej oraz o działalności władz i instytucji zdrowia publicznego w latach 1934–1935. – Warszawa : Polskie towarzystwo higieniczne, 1937. – 150 p .
4. Государственный архив Гродненской области. – Ф. 544. Оп 1. Д. 15.
5. Archiwum Akt Nowych w Warszawie. – Z. 15. Sygn. 12.

**УДК [811.161.3:378.6.016]:81’38**

***Т. А. Карніеўская***
*Установа адукацыі*
*«Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# БЕЛАРУСКІ АНТРАПАНІМІКОН ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ІМЕНАСЛОВА СТУДЭНТАЎ ГДМУ)

***Уводзіны***

Уласныя імёны складаюць значную частку лексічнай сістэмы многіх моў свету. Антрапанімія (асабліва рэгіянальная) заўсёды прыцягвае да сябе ўвагу не толькі спецыялістаў, але і людзей, далёкіх ад лінгвістыкі. Гэтае становішча склалася дзякуючы своеасаблівай дваістай прыродзе антрапонімаў: з аднаго боку, любое ўласнае імя з’яўля-

ецца ў першую чаргу лінгвістычнай адзінкай, з другога, будучы яшчэ і сацыяльным сімвалам, выклікае цікавасць любога члена грамадства, бо няма чалавека без імя і няма чалавека, які б не цікавіўся рознымі аспектамі існавання свайго імя. У сучаснай антрапаніміцы адным з важных яе аспектаў з'яўляецца "далейшае вывучэнне рэгіянальных сістэм асабовых імён у сінхранічным, дыяхранічным аспектах" [1, с. 172].

***Мэта***

Вызначэнне колькасных паказчыкаў ужывання і асноўных матывацый надання імя на прыкладзе беларускага іменаслова пачатку XXI стагоддзя (2001–2005 гг.).

***Матэрыял і метады даследавання***

Асноўным матэрыялам сталі вынікі анкетавання студэнтаў 1 курса Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта 2022–2023 гадоў навучання, якія пражываюць у Беларусі (прадстаўлены ўсе шэсць абласцей рэспублікі) і з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Напісанне імён на беларускай мове падаецца згодна з пашпартнымі данымі. Перавага колькасці жаночага іменаслова над мужчынскім тлумачыцца суадносінамі колькасці асоб у вучэбных групах адзначанай установы.

***Вынікі даследавання і іх абмеркаванне***

Усяго за адзначаны перыяд у разглядаемым іменаслове было ўжыта 30 мужчынскіх і 33 жаночыя імя. Найбольш ужывальнымі з'яўляюцца мужчынскія імёны *Дзмітрый, Уладзіслаў, Кірыл, Максім.* У адпаведную групу папулярнасці ўваходзяць таксама жаночыя антрапонімы *Анастасія, Кацярына, Дар'я, Лізавета, Аліна.* Звяртае на сябе ўвагу той факт, што ўсе названыя імёны вызначаюцца традыцыйнасцю.

Таксама неадзінкавым ужываннем вызначаюцца імёны *Данііл, Павел, Раман, Станіслаў; Алена, Аляксандра, Ангеліна, Ганна, Дзіяна, Ірына, Карына, Крысціна, Ксенія, Сняжана, Яна, Яўгенія.* Зыходзячы з вопыту работы з колькаснымі падлікамі антрапонімаў XX—XXI стагоддзяў, адзначым, што такія імёны, як *Павел, Раман; Алена, Аляксандра, Ганна, Ірына, Яўгенія* з'яўляюцца т.зв. "скразнымі", г.зн. ужываюцца на працягу ўсяго перыяду назірання аўтара за фукцыянаваннем беларускага іменаслову (як мінімум, з 1951 г. і па сённяшні дзень), пры гэтым яны вызначаюцца неадзінкавым ужываннем і часта знаходзяцца ў складзе першай дзясяткі папулярнасці (напрыклад, такія онімы, як *Павел, Алена, Ганна, Ірына*).

Сярод адзінкавых антрапонімаў сваёй нетрадыцыйнасцю прыцягваюць увагу такія адзінкі, як *Акім, Мірон, Адрыяна, Ілга, Стэфанія*.

З пункту погляду варыянтнасці, звязанай у першую чаргу з асаблівасцямі перадачы імён у сістэму беларускай мовы ў апрацаваным іменаслове адзначаюцца наступныя рады: *Анастасія — Настасся* (пераважае першая форма імя), *Елізавета — Лізавета* (пераважае другая форма імя, першая форма вызначаецца адзінкавасцю).

Што тычыцца месцаў асноўнага пражывання, то карціна наступная: Брэст і Брэсцкая вобласць – 3, Віцебск і Віцебская вобласць – 2, Гомель і Гомельская вобласць – 92, Магілёў і Магілёўская вобласць – 27, Мінск і Мінская вобласць – 5 асоб.

У сувязі з тым, што працэс надання імя "дэтэрмінаваны цэлым шэрагам узаемадзеючых сацыяльных і псіхалагічных фактараў" [2, с. 7], а таксама тым, што "ў выніку выбару імя на ўзроўні яго надання… ажыццяўляецца сацыялізацыя індывіда" [2, с. 7], неабходна звярнуць увагу на прынцыпы намінацыі.

Гэтыя намінацыі ў сучасным грамадстве даволі разнастайныя. Пачнем з разгляду найбольш папулярных матываў выбару імя:

— *імя спадабалася: адзін з* самых распаўсюджаных матываў выбару імя (9,09 % у мужчынскім і 10,08 % у жаночым іменаслове). Трэба адзначыць, што паняцце "спа-

дабалася" часцей за ўсё адносіцца да гукавога афармлення антрапоніма, а таксама да станоўчых асацыяцый, звязаных з пэўным імем (напрыклад, адна з рэспандэнтак указала, што яе назвалі Анастасія таму, што бацькам спадабалася памяншальная форма імя). Дарэчы, і ў мужчынскім, і ў жаночым іменасловах сярод імён, якія ўваходзяць у разглядаемую катэгорыю, адзначаюцца толькі традыцыйныя і даволі распаўсюджаныя адзінкі (*Арцём, Дзмітрый, Максім; Алена, Анастасія, Дар'я, Ірына, Кацярына, Лізавета, Наталля*). Даволі цікавым, на нашу думку, з'яўляецца той факт, што самі носьбіты не заўсёды згодны з меркаваннем сваіх намінатараў. Так, сярод імён, якія не падабаюцца самім намінаваным, адзначаюцца такія, як *Ігар, Ілья, Ягор; Дар'я, Карына, Кацярына, Крысціна*.

— *у гонар якой-небудзь асобы* (часцей за ўсё блізкага родзіча). Так, хлопцаў назвалі ў гонар бацькі (*Аляксандр*), дзеда (*Павел, Ян*), сябра (*Акім*). Кола асоб, у гонар якіх назвалі дзяўчын, больш шырокае: бабулі (*Вольга, Ганна*), прабабулі (*Сафія, Стэфанія*), свекрыві (*Дар'я*), дзеда (*Аляксандра*). Трэба, адзначыць, што ў гэтую катэгорыю ўваходзяць і назвы ў гонар актрыс (*Адрыяна, Анастасія*), песень (*Елізавета, Карына*) і нават любімага часопіса маці адной з дзяўчын-рэспандэнтак — Лізавета (часопіс "Ліза"). Гэтая прычына намінацыі характэрна для 9,09 % носьбітаў у мужчынскім іменаслове і 14,29 % у жаночым.

— *па святцах (царкоўным календары)*. Гэтая прычына намінацыі стала распаўсюджанай прыкладна з пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя і стабільна займае адно з галоўных месцаў як у мужчынскім (11,36 % носьбітаў), так і ў жаночым іменасловах (5,95 % носьбітаў). Дзякуючы гэтыму прынцыпу намінацыі студэнты носяць імёны *Аляксей, Кірыл, Міхаіл, Станіслаў; Анастасія, Ганна, Марыя, Настасся*.

Сярод іншых, менш папулярных, прычын надання імя можна адзначыць:

— *па значэнні імя* (тычыцца толькі жаночага іменаслова): *Вера, Ксенія, Сняжана* (адзначана два выпадкі іменавання: адну дзяўчыну назвалі так таму, што нарадзілася зімой, другую таму, што ў дзень яе народзінаў ішоў першы ў сезоне снег), *Юлія* (вельмі жвавая);

— *ад супраціўнага*, г.зн. назвалі супраць жадання іншых родзічаў: *Канстанцін* (каб не назвалі Мікіта), *Яраслаў* (насуперак выбару імя Ягор), *Аліна* (не Паліна), *Вікторыя* (не Юлія), *Ганна* (не Серафіма), *Лізавета* (не Аляксандра).

Сярод найбольш цікавых і рэдкіх намінацый адзначым наступныя: дзяўчыну назвалі *Алеся*, бо ў санаторыі з такой назвай пазнаёміліся яе бацькі; яшчэ адну студэнтку назвалі *Яўгенія* таму, што маці падабаюцца імёны, якія могуць належаць асобам і жаночага, і мужчынскага полу; дзяўчыну назвалі *Кацярына* ў гонар імператрыцы (а яе родную сястру па той жа прычыне назвалі Лізавета); хлопцу надалі імя *Станіслаў* у гонар гістарычнай асобы (караля з дынастыі Ваза).

Адзначана тры выпадкі іменавання ў змешаных сем'ях: у сям'і беларуса і казашкі хлопца назвалі *Уладзіслаў*, у сям'і карэйца і беларускі дзяўчыне надалі імя *Дар'я*, а нігерыец і беларуска выбралі для дачкі імя *Стэфанія* (дарэчы, у гонар бабулі бацькі). Як бачна, ва ўсіх выпадках антрапонімы з'яўляюцца традыцыйнымі для славянскага іменаслова.

***Заключэнне***

1. Вывучэнне рэальнага беларускага антрапанімікона з пункту погляду як лінгвістычных, так і сацыяльных фактараў дазваляе значна пашырыць веды ў лексічнай сістэме сучаснай беларускай мовы.

2. Аналіз прычын намінацыі ў антрапанімнай сістэме Беларусі спрыяе больш глыбокаму разуменню сацыяльных працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Ковалевская, А. Ю. Белорусская антропонимика: история становления и векторы развития / А. Ю. Ковалевская // Мова і літаратура ў XXI стагоддзі: актуальныя аспекты даследавання : матэрыялы VI Рэсп. навук.-практ. канф. маладвх навукоўцаў, прысвеч. 100-годдзю Беларус. дзярж. ун-та, Мінск, 12 сак. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал. : В. У. Зуева (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2021. — С. 168—172.

2. Мезенко, А. М. Антропонимное пространство Витебщины : монография / А. М. Мезенко, Т. В. Скребнева. — Витебск : ВГУ им. П.М. Машерова, 2013. — 148 с.

**УДК 811.161.3’276:61(476.5)**

***С. Ю. Касьяненка***
*Установа адукацыі*
*«Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# ДЫЯЛЕКТНЫЯ НАЗВЫ НЕКАТОРЫХ ХВАРОБ У ГАВОРКАХ ВІЦЕБШЧЫНЫ

***Уводзіны***

Хваробам падвержаны кожны чалавек. Прычыны хвароб разнастайныя і шматлікія, што дае магчымасць класіфікаваць іх па розных тыпалагічных прыкметах. На працягу жыцця ў чалавека могуць быць прыроджаныя і набытыя хваробы, інфекцыйныя хваробы, хваробы парушэння абмену рэчываў, пухлінныя хваробы і г. д. У залежнасці ад узроставай, гендэрнай, прафесійнай прыналежнасці вылучаюцца хваробы дзіцячыя, жаночыя, мужчынскія, прафесійныя, хваробы пажылых людзей. Класіфікацыя хвароб адбываецца па тым, якія менавіта органы або сістэмы арганізма яны закранаюць: хваробы стрававальнай сістэмы, хваробы сардэчна-сасудзістай сістэмы, нервовыя хваробы, унутраныя хваробы, хваробы органаў дыхання, зроку і шматлікія іншыя.

Вопыт класіфікацыі назваў хвароб мае пэўную традыцыю. У сучасным мовазнаўстве магчыма класіфікацыя, у якой намінацыі аб’ядноўваюцца, перш за ўсе, па прадметных прыкметах (лексічныя адзінкі, якія абазначаюць хваробы), таксама могуць разглядацца структурныя характарыстыкі і розныя семантычныя мадэлі словаўтварэння.

У лексічнай сістэме беларускіх гаворак не апошняе месца займае лексіка народнай медыцыны, фарміраванне якой адбывалася пад уплывам сацыяльных і гісторыка-этнаграфічных фактараў і перадавалася з пакалення ў пакаленне. Назвы хвароб складаюць пэўную частку акрэсленай лексічнай сістэмы і з’яўляюцца прадметам нашага даследавання. Аб’ектам даследавання з’яўляюцца “Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны”, “Дыялектны слоўнік Касаўшчыны” і “Слоўнік Сенненшчыны”.

***Мэта***

Прааналізаваць лексіка-тэматычныя групы назваў хвароб, якія зафіксаваны у гаворках Віцебшчыны.

***Метады даследавання***

Апісальны, параўнальны.

***Вынікі даследавання і іх абмеркаванне***

Прааналізаваўшы дыялектны матэрыял, прадстаўлены ў “Рэгіянальным слоўніку Віцебшчыны”, “Дыялектным слоўніку Косаўшчыны” і “Слоўніку Сенненшчыны”, былі